

Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская


Масава-палітычны штотыднёвік

Выдавец УП "Газета Слонімская" Выходзіць адзін раз на тыдзень Заснавана 24 сакавіка 1997 года

№29 (371) Серада, 14 ліпеня 2004 года www.gs.promedia.by

32 старонкі свежай і разнастайнай інфармацыі

ФОТАФАКТ



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ У гарадскім парку на свяце горада вялікае захапленне ў дзетвары выклікаў гэты надзіманы футбаліст

"ГОРЯЧАЯ ЛИНИЯ" «ГАЗЕТЫ СЛОНІМСКАЙ»

В четверг, 15 июля, с 16.00 до 18.00 в редакции "ГС" будет работать "горячая линия". Дежурные корреспонденты Ольга Шинкевич и Янина Мельникова будут принимать все вопросы, которые интересуют читателей "ГС". Наши телефоны: 2-14-39, 4-79-34.

Звоните, если у вас есть вопросы, просьбы, пожелания, интересная информация, которой вы хотите поделиться с нами.

• • • «Газету Слонімскую» чытаюць Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы і іншыя гарады Беларусі • • •

СИТУАЦИЯ

МАКСИ-проблемы мини-РЫНКА

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

На мини-рынке по улице Брестской — переполох: крик, гам, возмущенные голоса продавцов и покупателей перекрывают шум проезжающих мимо машин. На корреспондентов "ГС", приехавших по звонку, накидываются сразу с десяток человек.

– Здесь очень удобно торговать людям! Рядом дачи – Чемеры и Лобазовка. Пятый маршрут автобуса ходит. Здесь мы хотим торговать во второй половине дня.

– Мы торгуем на территории мини-рынка. Просто здесь нет столов. Пусть нам поставят столы, обустроят места и дадут продавать выращенное своими руками.

– На мини-рынке мест нет. А нас здесь не менее 50-и человек. Куда идти? Как продать выращенные на участке лук, картошку, капусту?

– На центральном рынке продавать можно до двух часов дня, не больше. Там просто не успеешь овощи продать, а они ведь не будут лежать. Все должно быть свежим, вот и идем сюда!

– Людям удобно здесь покупать. Они идут вечером с работы, заходят на рынок за свежей зеленью, фруктами, овощами. Но уже полтора года власти заламывают старикам, пенсионерам руки, отбирают удостоверения, творят полный беспредел, вместо того чтобы обустроить места торговли.

– Есть ведь указ Лукашенко дать торговать сельскому жителю, чтобы село развивалось, а нас только унижают, оскорбляют...

Дело в том, что буквально за десять минут до приезда корреспондентов продавцов посетили работники милиции. Конфликту продавцов сельхозпродукции мини-рынка на улице Брестской и местных чиновников – не один год. Каждое лето, когда на грядках сельчан и дачников созревает первая клубника, вырастает молодой картофель и сочная зелень, возникает вопрос, как продать результат своего труда. С одной стороны, для торговли этим товаром не нужно оформлять лицензию на предпринимательскую деятельность. С другой – если денег не заплатить, можно так и остаться "с носом", вернее, с завядшими овощами и фруктами.

Сельчане в первую очередь идут торговать на центральный рынок города. Но стоять на нем можно только до двух часов дня. После этого времени рынок закрывается. Поэтому и приходится переносить товар в другое место, чтобы в течение дня успеть его продать.

Такое положение вещей удобно и продавцам, и покупателям. Возвращаясь с работы, слонимчане всегда могут прикупить что-нибудь к столу. А продавцы стоят здесь и до семи, и до восьми часов вечера, пока товар не раскупят.

Проблема в том, что торгуют садоводы и огородники почти на самой земле. И за забором мини-рынка. Хотя официально это тоже территория рынка, но она не обустроена для торговли – нет столов, навесов.

Зато есть контролеры и проверяющие, заглядывают сюда и работники санэпидстанции. Документы у продавцов в порядке: есть и справки лаборатории, и бумаги на земельные участки. Нет только одного – разрешения на торговлю. И хотя еще год назад в райисполкоме обещали разрешить эту ситуацию в пользу сельчан и пенсионеров, пока дело не сдвинулось с мертвой точки. Потому время от времени наведываются сюда сотрудники милиции, чтобы в который раз указать второй стороне конфликта ее место. Вернее, место, удобное для торговли, никто предлагать и не думает, просто гонят стариков и пенсионеров в три шеи.



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Торговать на земле неудобно, но другого места просто нет

Потому что, кроме дачников и сельчан, приходят сюда торговать и люди пожилые, пенсионеры, которым, чтобы насобирать денег на оплату коммунальных услуг зимой, все лето надо ходить в лес за ягодами и грибами. С утра наберут ведерко спелой черники – и на Брестскую. Глядишь, к вечеру – если не целое ведро сразу – по стаканчику раскупят. Вот тебе денежка на хлеб и молоко будет. И даже кое-что отложить можно.

Положение тех, кто торгует продовольственными товарами на благоустроенных рядах самого мини-рынка, тоже не лучшее. Из-за близости проезжей части. А с 1 сентября здесь будет вообще запрещено торговать продуктами питания. Выхлопные газы проезжающих мимо фур – соседство не только не приятное, но и опасное. Правда, по словам самих продавцов, разговоры о закрытии этой части рынка идут не первый год, а воз и ныне там. Потому что район тут большой, спальный, людям удобно иметь рядом такой рынок.

Покупают здесь продукты питания и работники исполкома, и работники санитарной станции, налоговой инспекции. Чисто по-человечески понимают опасения продавцов, но поделать ничего не могут: закон есть закон.

Предполагается предложить предпринимателям места на рынке "Коссовский", что по соседству с воинской частью. Правда, тут возникают опасения у продавцов и покупателей:

– Кто знает, что там хранится на воинских складах? Кто даст нам гарантию, что продавать продукты в том районе менее опасно? И потом, фуры и там идут плотным потоком, – жалуется покупатель Виталий.

Возможно, ситуация изменится, когда на этом участке дороги уменьшится поток машин: закончится строительство объездной дороги, и фуры перестанут ездить через Брестскую улицу. Тогда проблема количества выхлопных газов в воздухе в этом районе решится сама собой. ■

НАВІНЫ

19 ЛІПЕНЯ АДКЛЮЧАЦЬ ГАРАЧУЮ ВАДУ

У панядзелак, 19 ліпеня, спыняць падачу гарачай вады ў дамах на вуліцах Яршова, Тапалёвай, Скарыны, Брэсцкай, 17 Верасня, К. Маркса, Чырвонаармейскай, В. Крайняга, а таксама на праспекце Незалежнасці.

Пра гэта карэспандэнту "ГС" паведаміў дырэктар прадпрыемства ацяпляльных кацельняў і цеплавых сетак Слонімскага ГУП ЖКГ Уладзімір Шукала.

З'явіцца гарачая вада ў гарадскіх кватэрах не раней як у верасні. Такое доўгае адключэнне вады звязана з заменаю трубаў цеплатрасы. Так што ў астатнія тыдні лета будзем купацца і мыцца ў Шчары, на гарадскіх азёрах альбо ў лазні.

Сяргей ЧЫГРЫН

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ

13.07.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	600 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	6 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 000 - 1 500 руб.
Картофель (кг)	500 - 1 000 руб.
Капуста свежая	500 - 600 руб.
Морковь	1 200 руб.
Лук	600 - 1 200 руб.
Свёкла	350 руб.
Чеснок (за головку)	150 - 250 руб.
Помидоры	2 400 - 2 500 руб.
Огурцы	1200 - 1 300 руб.
Яблоки	2 000 - 2 900 руб.
Апельсины	2 200 - 2 400 руб.
Мандарины	3 000 - 3 400 руб
Лимоны	2 800 - 3 300 руб.
Киви	400 руб. шт.
Гранаты	3 100 руб.
Бананы	1 800 - 2 100 руб.
Свинина	4 500 - 9 450 руб.
Говядина	500 – 8 800 руб.
Телятина	–
Сало свежее	2 350 - 3 900 руб.
солёное	3 900 - 4 800 руб.
Селёдка	3 200 руб.
Макаронные изделия	1 200 - 1 400 руб.
Гречка	1 200 - 1 700 руб.
Рис	1 150 - 1 500 руб.
Мука (2 кг)	2 100 - 2 200 руб
Сахар	не продаётся
Подсолнечное масло, (1 л)	1 900 - 2 600 руб.
Мёд	12 000 руб.
Клубника	2 500 - 3 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ

13.07.2004 г.

"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2155	2190
1 EURO	2600	2710
1 ZL	525	595
1 RUR	70	74,5
"Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2155	2185
1 EURO	2620	2700
1 ZL	540	590
1 RUR	70	74,2
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2155	2185
1 EURO	2600	2700
1 ZL	550	600
1 LAT	3800	4060
1 LIT	600	790
1 UAH	370	420
1 GBP	3700	4050
1 RUR	70	75
Нацбанк РБ		
1 USD	2159	
1 EURO	2682.23	
1 RUR	74,11	

РЕАЛИИ

ДИРЕКТИВА №1 В ДЕЙСТВИИ

■ Аня КРАСИЦКАЯ

Директор использовал служебный автомобиль в личных целях.

Комитет государственного контроля Гродненской области на основании первичных материалов Слонимского межрайонного отдела финансовых расследований (начальник Владимир Ермола) и по результатам проверки оштрафовал на 190 тысяч рублей директора ОАО "Слонимский завод сухого обезжиренного молока" за нарушение порядка использования служебного легкового автотранспорта, а также действующего законодательства, регулирующего вопросы бухгалтерского учета и отчетности.

23 апреля этого года служебный автомобиль ГАЗ-3110, принадлежащий заводу сухого обезжиренного молока, был остановлен около деревни Денисово Дятловского района. В путевых листах, предъявленных директором этого предприятия Александром Буйчиком, не был отражен этот маршрут следования.

В ходе проверки работники госконтроля выяснили, что новый директор молокозавода с момента своего избрания ежедневно ездил от своего дома в деревне Денисово на работу и в обратном направлении на служебном автомобиле. Расстояние между этими двумя населенными пунктами составляет 35 километров. Итого в день директор "накатывал" 70 километров только от дома до работы.

При этом путевые листы оформлялись задним числом, после проведенной проверки, и только со дня, предшествующего задержанию машины.

Решение о предоставлении служебного автомобиля для нужд руководителя принял наблюдательный совет ОАО "Слонимский ЗСОМ". При этом, как говорится в акте проверки госконтроля, такое использование легкового автомобиля "не соответствует принципам и требованиям Директивы Президента РБ". Кроме того, расходы по содержанию и эксплуатации автомобиля включались в себестоимость продукции, что повлекло за собой ее удорожание. Также в акте отмечается, что использование горюче-смазочных материалов за счет средств завода усугубило и без того тяжелое финансовое положение завода. Так, на 1 апреля текущего года кредиторская задолженность ОАО "Слонимский ЗСОМ" составила 784 миллиона рублей, суммарная задолженность по банковским кредитам и бюджетным ссудам превысила 3 миллиарда рублей. ■

ОПРОС

СЛОНИМ. НАШИ ЛЮДИ

ХОРОШИЕ ДОРОГИ И КРЕПКИЕ ХОЗЯЕВА — МЕЧТА СЛОНИМЧАН

Последнее время в редакцию "ГС" звонят слонимчане, не довольные новыми автобусными остановками. Старые лавочки без навесов — плохо, новые — тоже многих не устраивают. Может, причина в том, что установили их, не посоветовавшись с народом?

"Чего не хватает сегодня нашему городу?" — с этим вопросом корреспондент "ГС" обратилась к жителям Слонима.



Дмитрий: — В Слониме не хватает хороших заасфальтированных дорог. Это главная проблема.



Елена: — Нет свежести, хочется видеть побольше улыбок, радостных лиц. И хочется иметь больше мест для развлечений, где можно отдохнуть.



Андрей: — Не хватает хорошей дороги от больницы на Барановичское шоссе.



Сергей: — Нашему Слониму нужно побольше красивых новых зданий, побольше торговых точек, магазинов, работающих вечерами. Не хватает маршрутных такси, они есть, но надо, чтобы было их больше. Хорошо, что у нас наконец появились красивые остановки. Хорошо, что взялись власти за реконструкцию старых зданий. Побольше бы их отреконструировали, в них можно сделать музеи.



Любовь Ивановна: — Городу нужен хороший, крепкий хозяин, который может навести порядок. Порядка — вот чего нам всем не хватает.



Елена: — Молодежи не хватает мест развлечений. Нужна хорошая дискотека, особенно для тех, кому за 18 лет. Нам негде хорошо отдохнуть.

Янина МЕЛЬНИКОВА

КОММУНАЛКА

ТАРИФЫ БУДУТ ПОВЫШАТЬСЯ

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

Тарифы на коммунальные услуги — даже летом больная тема. Совсем недавно заместитель министра жилищно-коммунального хозяйства Валерий Ноазак заявил на пресс-конференции, что тарифы на оплату коммунальных услуг не будут повышаться, а только индексироваться.

Представьте себе удивление слонимчанки Веры Фёдоровны, когда на следующий день после опубликования в газете заявления высокопоставленного чиновника она получила очередной счет за техобслуживание и капитальный ремонт: стоимость услуг выросла. Не поверив своим глазам, пенсионерка подумала, что ошиблись в жилищно-коммунальной службе при начислении суммы к оплате. Позвонила в ЖЭС и услышала в ответ, что ошибки не было. Тогда пенсионерка твердо решила, что местные чиновники самовольничают и, вероятно, решили положить деньги в свой личный карман. Возмущению Веры Фёдоровны не было предела: пенсия-то у нее небольшая, думала, хоть летом, без счетов за отопление, свести концы с концами, а тут такое безобразие. В поисках справедливости слонимчанка обратилась в редакцию "ГС":

— Помогите вывести их на чистую воду! Это надо же, как народ обманывают. Вот в Минске говорят, что цены на коммунальные услуги повышаться не будут, а нашим все нипочём... Совсем совесть потеряли!

В поисках правых и виноватых корреспондент "ГС" отправилась в ЖЭС №1. И оказалось, что виноватых — нет! Просто минский чиновник, мягко говоря, лукавил, называя одни и те же вещи разными именами. Действительно, в планах министерства коммунального хозяйства не было повышения тарифов на коммунальные услуги, в том числе техобслуживание и капремонт. Но, как пояснила бухгалтер жилищно-коммунальной службы, индексация — это приведение действующих тарифов к уровню, обеспечивающему возмещение организациям жилищно-коммунального хозяйства потерь, вызванных инфляцией. А по сути, индексация и есть повышение тарифа, просто происходит она, что называется, задним числом. Индексация цен производится ежемесячно, с учетом стоимости затрат производителей.

> ...по сути, индексация и есть повышение тарифа, просто происходит она, что называется, задним числом.

Вот и получается, что Вера Фёдоровна, поверив столичному чиновнику, незаслуженно обидела местных: они ничего сами не выдумывают, а только следуют министерским инструкциям. В том время как "наверху" у кого-то не хватает мужества назвать вещи своими именами.

К слову сказать, Министерство жилищно-коммунального хозяйства утвердило новую «Инструкцию о порядке оплаты населением коммунальных услуг». В ней прописан ряд понятий, с которыми у Веры Фёдоровны тоже возникли проблемы. В частности, пенсионерка столько лет платит деньги за техническое обслуживание, но так и не может понять, на какие цели эти деньги идут.

Техническое обслуживание жилого дома включает затраты подрядных организаций по текущему содержанию его и придомовых территорий (текущая эксплуатация и ремонт общего имущества жилых домов, уборка и освещение помещений, придомовой территории).

Наши деньги должны идти на содержание в должном виде лестничных клеток, лифтов, коридоров, крыш, электрического и сантехнического оборудования, а также на озеленение и благоустройство дворов, на уборку мусора, снега, ремонт проездов и проходов к дому. Плата за техническое обслуживание должна использоваться на текущие нужды, в то время как наши отчисления на капитальный ремонт предусматривают накопление этих средств на счетах ЖЭСов, местных исполнительных и распорядительных органов.

На деле же выходит, что жильцы многоквартирных домов уже давно привыкли покупать за свои "кровные" лампочки и замки в подъезды, платить уборщицам за чистоту, сажать деревья и разбивать клумбы во дворах. Потому что деньги легче отдать, чем получить обратно, даже в виде услуг. ■

ВЫТВОРЧАСЦЬ

НА "ТЭКСТЫЛЬШЧЫКУ" НЯМА ВАДЫ І НЕ ДАЮЦЬ МАЛАКА

На слонімскай фабрыцы "Тэкстыльшчык" працяглы час няма вады — адключылі за няўплату. У рэдакцыю "ГС" тэлефанавалі работніцы фабрыкі і скардзіліся, што змена ў 25-30 чалавек мые рукі ў адным вядры.

Жанчыны просяць слесара прынесці вады з калонкі за 300 метраў. Прыбіральні ў цэхах зачыненыя, таму па патрэбе ўсе ходзяць у туалет на двары.

Не лепшым чынам на прадпрыемстве аплочваецца праца. Так, заробак за травень выплацілі толькі 2 ліпеня і толькі 6 ліпеня — дапамогу на дзяцей за той жа травень. Па словах тэкстыльшчыц, заробак ім не павышаўся апошнія 4 гады.

На мінулым тыдні работніцы трэцяга ўчастка, якім павінны за шкоднасць вытворчасці кожны дзень выдаваць бясплатнае малако, атрымалі замест малака яйкі... за студзень. Менавіта з таго часу (ужо паўгода) малака на працы ім не давалі.

Як патлумачыла намеснік дырэктара прадпрыемства па інфармацыйнай працы, старшыня прафкама Вольга Герасімчык, малака работніцам не выдавалі па прычыне складанага фінансавага становішча на прадпрыемстве. Паводле санітарных нормаў, са згоды работніка малако можна замяніць на яйкі, тварог ці іншыя прадукты. Аднак калі прадпрыемства развілічыцца па запазычанасці перад работнікамі за шкоднасць вытворчасці за пяць месяцаў і ці будзе за што набываць малако ў найбліжэйшы час, старшыня прафкама адказаць не магла. Невядома таксама, калі фабрыка зможа разлічыцца з водаканалам за ваду і запрацуе водаправод. А што цэлая змена мые рукі ў адным вядры, дык тут, заўважыла Вольга Мікалаеўна, жанчыны трохі перабольшваюць.

Наконт аплаты працы прагнозы таксама не аптымістычныя. Па словах начальніка планава-эканамічнага аддзела Надзеі Скурат, на прадпрыемстве няма росту вытворчасці, прадукцыя дрэнна прадаецца, а значыць, няма рэальнай магчымасці павысіць заробак. Тым не менш, як паведаміла спецыяліст, зарплата хоць крыху расце. Так, у траўні пасля індэксацыі заробак падрос на 10 тысяч рублёў. Сярэдняя зарплата на фабрыцы за мінулы месяц склала 185 тысяч рублёў. Выплочваць заробак, як і дапамогу на дзяцей, павінны адзін раз у канцы кожнага месяца. Калі ж фінансаў няма, здараюцца затрымкі.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

РАБАЎНІКОЎ ЗНАЙШЛІ

Устаноўлены асобы рабаўнікоў, якія сёлета каля крамы №31 у Слоніме збілі мужчыну і адабралі ў яго грошы.

Супраць аматараў паздзекавацца з чалавека і адабраць чужое ўзбуджана крымінальная справа.

ЗАГАРЭЎСЯ ТРАКТАР

На мінулым тыдні загарэўся трактар, які належыць раённаму унітарнаму сельгаспрадпрыемству "Новадзевяткавічы".

Па факце загарання праводзіцца праверка.

КАПАЮЦЬ БУЛЬБУ І ШКОДЗЯЦЬ ЛЕЦІШЧЫ


Апошнім часам у райаддзел міліцыі пачалі паступаць заявы ад уладальнікаў дачных участкаў і жыхароў прыгарадных вёсак аб тым, што на іх сотках пагаспадарылі зладзеі.

Маладая бульба ўжо падрасла, клубніцы паспелі, агуркі з'явіліся — і... пачаўся сезон крадзяжоў сельгаспрадукцыі. Але шкодзяць не толькі грады.

Гэтак, на мінулым тыдні ў дачны дамок сланімчанкі ў раёне Лабазоўкі спрабавалі залезці маладыя людзі. Яны пабілі ў вокнах шыбы. А потым запальнічкамі папалілі плёнку на парніку. Акрамя таго, патапталі яшчэ і грады.

Невядома таксама, хто адкажа за патаптаную на сотках пенсіянераў з Пятралевіч бульбу. Амаль палову сотак 4 ліпеня там здраталі цяляты СВК "Паўлава-Агра".

Юрка КАРПАЧ


Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ На месте тенистой аллеи — пни

НЕ РУБИТЕ ДЕРЕВЦА, НЕ РУБИТЕ!

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

Каждый человек в своей жизни должен сделать три вещи: построить дом, вырастить сына и посадить дерево. Последовательность значения не имеет.

Жители дома №107/3 по улице Брестской 15 лет назад решили облагородить территорию вокруг своего жилища: посадить деревья, кустарники, разбить клумбы. Старались сделать свой двор уютным для всех — и взрослых, и детей.

Шли годы, молодые деревца подрастали, стали радовать жильцов своей пышной зеленью, под которой в жаркую летнюю погоду укрывались, сидя на лавочках, мамы с детьми и бабушки с внуками.

Вот только красоте этой скоро пришел конец: на прошедшей неделе, когда почти все взрослое население дома было на работе, деревья срубили, оставив одни пеньки.

Как объяснили возмущенным жильцам, рубили деревья работники водоканала. Рубили не посоветовавшись, не спросив. Срубили все, не пощадив даже вишенки около лавочки.

— Как так можно? Мы же их сажали с такой любовью, заботой! Под ними было приятно посидеть, поговорить! А тут приехали какие-то вандалы, срубили все под корень! А ведь деревья так долго растут, если посадим новые, сколько еще ждать, пока они зазеленеют... — жаловались звонившие в редакцию "ГС" слонимчане.

Случай этот, конечно, не единичный, и можно было бы в очередной раз только посочувствовать жильцам. Только вот аргументы второй стороны конфликта тоже не лишены здравого смысла:

— Мы вырубали деревья не по собственной воле, а по необходимости. Эти деревья находились вблизи от канализационного коллектора, если бы их не срубили, понятно, что они нарушили бы целостность труб. У нас было разрешение инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды, а также разрешение ПО ЖКХ, — пояснил главный инженер водоканала Олег Конон.

Остаться без воды мог не только этот дом, но и другие. Но жильцам этот аргумент не пришелся по вкусу. Вода-то в кранах пока течет, а поговорка "если бы да кабы" еще не потеряла для них своей актуальности.

В этом конфликте понять можно и тех и других. Кто же 15 лет назад знал, что сажал дерево в охранной зоне, где его быть не должно? Понятно, что жители дома №107/3 хотели сделать как лучше. Потому что скорее всего средств у самого ПО ЖКХ на благоустройство не было. А гулять с детьми хотелось не на пустыре.

Вот и получилось, что больше десятка деревьев, которым еще расти и расти, бессильно упали на землю, уныло свесив радующую всех листву. Они стали главными жертвами в этой истории.

Почему никто даже не попытался объяснить жильцам только что построенного дома, где надо сажать деревья, а где это делать не стоит? Почему сейчас, когда деревья стали вырубать, это делали тайком, не поговорив с теми, кто их посадил?

А дело уже сделано... Двор осиротел, жильцы в очередной раз убедились в "бесчувственности чиновников", чиновники, как всегда, "не подумали о людях". Остается только надеяться, что с домом и сыновьями у слонимчан получится лучше. ■

НАВІНЫ

СВЯТА ВУЛІЦЫ ЧАРНЯХОЎСКАГА

У мінулую суботу слонімцы адзначылі 60-годдзе вызвалення Слоніма ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

З гэтай нагоды ў гарадскім парку гучалі песні, музыка і працавалі гандлёвыя кропкі.

Шмат цікавых гульняў было для дзяцей. Ды і дарослыя не сумавалі: хто паказваў свае здольнасці ў стральбе, конкурсах, хто піў піва, а хто і танчыў.

У гэты ж дзень жыхары вуліцы Чарняхоўскага адзначалі сваё свята — дзень вуліцы.

На стадыёне "Дынама" сабралася нямала людзей, якіх вайскоўцы частавалі салдацкаю кашаю. Быў у гэты дзень на стадыёне салют, выстава ваенных фотаздымкаў, гучалі песні і вершы.

Сяргей ЧЫГРЫН

Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ У чарзе па салдацкую кашу

НАВІНЫ

ПАДАРАЖАЎ ПРАЕЗД НА ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ

З 10 ліпеня праезд у гарадскім транспарце Слоніма стаў каштаваць 250 рублёў.

Поўны месячны праязны білет цяпер слонімцы змогуць купіць за 10 010 рублёў, а льготны — за 5 тысяч рублёў.

Тарыфы на перавозку пасажыраў у гарадскіх маршрутках па Слоніме ўстаноўлены ў памеры 350 рублёў за адну паездку.

Нагадаем, што праезд у Мінску ў гарадскім транспарце стаў каштаваць ужо 300 рублёў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННІ

ПОШТЫ Ў ЧАЦВЕР НЕ АТРЫМАЛІ

Жыхары новай Брэсцкай вуліцы ў мінулы чацвер не атрымалі паштовай карэспандэнцыі.

У той дзень двое работнікаў раённага вузла паштовай сувязі, якія абслугоўвалі гэты раён, не выйшлі на працу.

Аказалася, што напярэдадні, падчас сумеснага распіцця спіртных напояў, мужчыны пачалі паміж сабой бойку. У выніку ад атрыманых пашкоджанняў адзін з іх памёр.

У пятніцу пошту жыхарам мікраёна падвозілі ўжо іншыя людзі.

У ШЧАРЫ ЗНАЙШЛІ ТРУП ЖАНЧЫНЫ

У нядзелю, 11 ліпеня, у рацэ Шчара ў раёне Лабазоўкі знайшлі труп пажылой мясцовай жыхаркі.

Выяўлены прыкметы, якія даюць падставу меркаваць, што жанчына скончыла жыццё самагубствам.

Юрка КАРПАЧ

З ЗАЛЫ СУДА

У ІСКУ — АДМОВІЦЬ...

Апошнім часам у суд усё часцей пачалі трапляць справы, якія датычацца ўзаемаадносінаў работніка і наймальніка. Вось і нядаўна слухалася грамадзянская справа па іску аб узнаўленні на працы і выплаце маральнай кампенсацыі былой прадаўшчыцы Слонімскай птушкафабрыкі Таццяны Попінай.

Таццяна Дзмітрыеўна ўладкавалася працаваць на птушкафабрыку ў сакавіку мінулага года. Спачатку працавала прадаўцом выязнога гандлю, а ў лютым гэтага года яе перавялі гандляваць у шапік птушкафабрыкі на Брэсцкай вуліцы.

Прыкладна праз месяц пасля гэтага, вечарам у суботу, 13 сакавіка, камісія прадпрыемства на чале з дырэктарам Дзмітрыем Зайкоўскім правярала працу чатырох сваіх шапікаў, у тым ліку і гандлёвую кропку Таццяны Попінай. Празерка адбывалася вечарам, калі працоўны дзень ужо закончыўся, і, як сцвярджала Таццяна Дзмітрыеўна, яе на месца не запрасілі. Падчас праверкі выявілася, што ў той дзень прадавец не замяніла кантрольку ў кантрольным замку і не зрабіла таварных справаздач за апошнія тры дні. Намеснік дырэктара па камерцыі Валерый Катко патэлефанаваў дамоў Таццяне Попінай і спытаўся пра таварныя справаздачы. Прадавец адказала, што яны яшчэ не зроблены, і паабяцала, што здасць справаздачы ў панядзелак. Па словах Попінай, Катко адказаў ёй, што ў панядзелак яна будзе размаўляць з дырэктарам, а пра тое, што ў гэты час правяраюць яе шапік, — не сказаў ні слова.

Даведалася Попіна пра праверку толькі назаўтра на працы ад вадзіцеля Сасноўскага, ён жа старшыня прафсаюзнага камітэта фабрыкі. Камісія выявіла падчас праверкі недахоп на агульную суму 43 тысячы 514 рублёў. У панядзелак адбылася непрыемная размова ў дырэктара, пасля чаго Таццяна Попіна напісала тлумачальную запіску пра недахопы ў сваёй працы.

Тое, што ў яе знайшлі недахоп, Таццяна Попіна тлумачыла тэхнічнымі прычынамі. Грошы пакупнікоў, па яе словах, часам завальваліся паміж сценкай шапіка і халадзільнікам. Дастаць іх адтуль было амаль немагчыма. Таму яна альбо давала рэшту пакупнікам сваімі грашыма, альбо таварам, спадзеючыся, што пазней пакрые недахоп з-пад халадзільніка. І сапраўды, пасля размовы з дырэктарам з-пад халадзільніка ў шапіку выграблі ўсё змесціва — там аказалася 75 тысяч рублёў, прычым была адна купюра вартасцю ў 50 тысяч. Грошы, некаторыя прадукты пакупнікоў і яйкі падалі туды два тыдні.

Пасля праверкі Таццяна Попіна адпрацавала яшчэ амаль месяц, да 12 красавіка, і дырэктар адхіліў яе ад працы. Патлумачыў гэта тым, што ў гэты час аддзел міліцыі па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю і падатковы правяралі дзейнасць гандлёвых кропак птушкафабрыкі. Кампетэнтныя органы пацвердзілі факты недахопу і парушэнняў у працоўнай дзейнасці Попінай. Пасля чаго, 14 траўня, дырэктар птушкафабрыкі звольніў Таццяну Попіну з працы з запісам у працоўнай кніжцы "Недавер наймальніка".

З-за такіх пертурбацыяў жанчына знервавалася і трапіла ў бальніцу. А калі падлячылася, то звярнулася ў суд з іскам аб узнаўленні на працы і вымяшчэнні маральнай шкоды ў памеры 1 мільёна рублёў.

На тры пасяджэнні расцягнулася слуханне гэтай справы. Таццяна Дзмітрыеўна прызнавала, што ў яе працы былі недахопы. Але жанчына не магла пагадзіцца з матывацыяй дырэкцыі прадпрыемства і артыкулам, паводле якога яе звольнілі. Не пастаўлены на кантроль замок, не здадзеныя своечасова справаздачы і 43 514 рублёў недахопу — не такія ўжо вялікія парушэнні, каб пазбаўляць чалавека працы. Да такой думкі схіляла ўдзельнікаў працэсу і адвакат Попінай. Сама ж заявіцелька выказвала згоду (калі суд задаволіць яе іск) працаваць на пасадзе, не звязанай з матэрыяльнай адказнасцю.

Дырэктар птушкафабрыкі Дзмітрый Зайкоўскі, у сваю чаргу, даводзіў суду, што дзейнічаў у гэтым выпадку згодна з літарай закона. Ён некалькі разоў згадваў у сваіх выступленнях Дырэктыву прэзідэнта №1, казаў аб недапушчэнні на вытворчасці лібералізму, вельмі перакананча апераваў юрыдычнымі дакументамі, і... закон застаўся на яго баку.

Пракурор кваліфікавала дзеянні адміністрацыі як правільныя, а суддзя пастанавіў у іску Таццяне Попінай адмовіць.

Таццяна Дзмітрыеўна сказала, што ўсё роўна справы так не пакіне і будзе абскарджваць рашэнне суда ў вышэйшых інстанцыях.

Мікола КАНАНОВІЧ

ГРОДНО

ВАЛЕРИЯ ЛЕВОНЕВСКОГО ОСТАВИЛИ В ТЮРЬМЕ ЕЩЁ НА МЕСЯЦ

Срок содержания под стражей лидера Общенационального стачкома предпринимателей, члена Координационного комитета Европейской коалиции «Свабодная Беларусь» Валерия Левоневского продлен до 15 августа.



■ Лидер стачкома предпринимателей Валерий Левоневский

Об этом супруге политзаключенного Марине Левоневской сообщил старший следователь прокуратуры Ленинского района Гродно Альфред Тонкевич. Срок содержания под стражей лидера гродненских предпринимателей продлен еще на месяц «в интересах следствия».

Валерий Левоневский находится под арестом уже более двух месяцев.

18 мая предпринимателю было предъявлено обвинение по статье 368 (часть 2) Уголовного кодекса – "Публичное оскорбление президента РБ совершено лицом, ранее судимым за оскорбление или клевету либо соединенное с обвинением в совершении тяжкого или особо тяжкого преступления". Данная статья предусматривает наказание в виде штрафа, либо исправительных работ на срок до 2 лет, или ограничением свободы на срок до 3 лет, или лишением свободы на тот же срок.

По мнению следствия, оскорбление главы государства содержится в листовках, распространяемых в Гродно накануне акции протеста предпринимателей 1 мая.

ХАРТИЯ-97

АРМИЯ

НА СЛУЖБУ МОЖНО УСТРОИТЬСЯ ЧЕРЕЗ ЦЕНТРЫ ЗАНЯТОСТИ

Гродненский городской центр занятости (ГЦЗ) начал предоставлять данные для желающих устроиться на военную службу по контракту. В свою очередь, списки вакансий подают самостоятельно военные части и военкоматы.

Как сообщили БелаПАН в Гродненском ГЦЗ, по последним данным, желающим предлагалось 16 военных профессий. Кроме сугубо армейских, таких, как командир роты или взвода, требовались специалисты гражданских специальностей – музыканты, электрики, строители.

На сегодняшний день в Гродненской области 20 процентов военных – контрактники. А в Вооруженных Силах Беларуси их вместе с офицерами и прапорщиками насчитывается более 52 процентов от всего личного состава. На должностях сержантов и солдат – около 7 тысяч. По информации штаба Западного оперативного командования, контрактник для нанимателя представляет больший интерес, чем солдат срочной службы. Хотя бы потому, что он дешевле, так как учится специальности один раз, а "срочники" меняются каждые полтора года.

Но даже на фоне безработицы многие вакантные места в армии остаются свободными. На военные должности подбираются люди без приводов в милицию и судимостей, годные по состоянию здоровья. Многих не устраивает и зарплата первого года – 200–300 тысяч рублей в месяц.

Наиболее активно на службу в армию по контракту идут жители районных центров, где найти работу особенно трудно.

Александр ХИЛИМОН

СЛОНИМ

«ВОЛЯ К РАЗВИТИЮ» ВЫИГРАЛА ПРОЦЕСС ПО «ДЕЛУ ТАСИС»

12 июля Хозяйственный суд Гродненской области удовлетворил иск общественного объединения «Воля к развитию».

Решение налоговой инспекции по г. Слониму о взыскании с организации налогов в размере 15 миллионов рублей за средства, полученные от Европейской комиссии в рамках программы технической помощи ТАСИС, отменено. Судья Олег Кадач обязал налоговую инспекцию компенсировать судебные издержки.

ХАРТИЯ-97

ЭКОЛОГИЯ

СОЗДАЮТСЯ ДВА БИОЛОГИЧЕСКИХ ЗАКАЗНИКА

НОВОГРУДОК. Два биологических заказника создаются в Новогрудском районе по решению местного райисполкома. Необходимость этого продиктована тем, что за последние годы численность диких животных в здешних лесах сильно сократилась в результате активной охотничьей деятельности.

Заказники будут располагаться в двух противоположных уголках региона. Один из них – на границе с Лидским районом, вдоль реки Извы, на территории 5 тысяч гектаров. Отсюда и его название – Извенский. На протяжении пяти лет он будет закрыт для охотников, рыболовов и туристов, чтобы животный и растительный мир смог за это время восстановить свой природный потенциал.

Другой заказник планируется разместить за Неманом, в Графской пуще, которая является частью Налибокской. Поскольку его территория займет угодья сразу трех районов – Столбцовского, Кореличского и Новогрудского, есть все шансы для придания заказнику статуса республиканского.

Александр ХИЛИМОН

ЭКОНОМИКА

ОБСУЖДАЛИ РАЗВИТИЕ

Вовлечение дополнительных ресурсов в устойчивое развитие Гродненской области — главный вопрос совместного немецко-белорусского семинара, который завершил свою работу на прошлой неделе в областном Комитете по сельскому хозяйству и продовольствию.

Он был организован в рамках программы поддержки Беларуси Минским международным образовательным центром (IBB).

Немецкая сторона поддерживает инвестиционные проекты по четырем направлениям: образование, экология, социальное развитие, малый и средний бизнес. На встрече активнее всего обсуждались вопросы развития и консультирования проектов по созданию в регионе бизнес-инкубаторов и сотрудничеству с СЭЗ "Гродно-Инвест". Немецкая сторона выразила готовность оказать финансовую поддержку проектам начиная с 2005 года.

Александр ХИЛИМОН

НОВОСТИ

ОКОЛО 1 000 ЛОШАДЕЙ ЕЖЕГОДНО ПРОДАЁТ В ИТАЛИЮ СПК "ОКТЯБРЬ-ГРОДНО"

ГРОДНО. Сельскохозяйственный производственный кооператив "Октябрь-Гродно" – одно из немногих хозяйств Беларуси, которое занимается откормом лошадей и продажей их за границу. Эту экономическую возможность зарабатывания валюты нынешний председатель кооператива Виктор Кремко использует уже на протяжении 20 лет.

За это время в Италию было отправлено около 20 тысяч лошадей. За деньги, полученные от продаж, а килограмм живого веса стоит 1,05 евро, СПК "Октябрь-Гродно" приобрел всю импортную сельскохозяйственную технику.

В этом году уже продано 393 лошади. Они откармливаются до 400–450 килограммов, а затем итальянским транспортом отправляются по адресам итальянских фирм.

В Гродненской области выращиванием лошадей с последующей их реализацией занимаются еще облгосплемпредприятие, СПК "Щучинагропродукт".

Александр ХИЛИМОН

СОЗДАЮТ АУДИОАРХИВ ГОЛОСОВ ВЕТЕРАНОВ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ

СВИСЛОЧЬ. Свислочский райком БРСМ проводит акцию по созданию аудиоархива голосов ветеранов Великой Отечественной войны и жителей тыла.

В этой молодежной организации для этих целей было приобретено 5 аудиокассет, которые после окончания акции будут переданы в местный историко-краеведческий музей. Кроме того, планируется, что созданный архив будет использоваться в передачах местного радиовещания.

"Старшеклассники навещают ветеранов и пожилых людей и, с их согласия, записывают воспоминания этих людей, связанные с войной", – подчеркнули в Свислочском райкоме БРСМ.

Вопросы, задаваемые членами БРСМ участникам акции, касаются как фактических сведений о местах боев, значительных событиях и т.д., так и субъективных впечатлений опрашиваемых. "Если человек не принимал участия в военных действиях, мы спрашиваем о том, каким был быт в наших городах и деревнях во время оккупации, как вели себя немецкие солдаты, как проявляли себя партизаны и многое другое", – отметили в райкоме.

"Интерфакс"

АДБЫЎСЯ МІТЫНГ КААЛІЦЫІ "5+"

МАСТЫ. Праводзіць мітынг дазволілі ўлады. На яго сабраліся каля 100 чалавек.

Арганізаваў мітынг кіраўнік Гродзенскай абласной арганізацыі БСДГ Язэп Палубятка. Удзельнікі выступалі ў абарону тых, хто з 1 жніўня павінен працаваць па кантракце.

На мітынгу прамаўлялі Сяргей Калякін, Людміла Гразнова і Аляксей Кароль. З Гродна прыехалі прадстаўнікі кааліцыі "5+" і сябры грамадскіх арганізацый.

Радыё Свабода

"ГРОДНОПРОМСТРОЙ" ПОЛУЧИЛО СЕРТИФИКАТ МЕЖДУНАРОДНОГО СТАНДАРТА

ГРОДНО. Сертификат на соответствие требованиям международного стандарта СТБ ИСО 2000–2001 получило открытое акционерное общество "Гродномпромстрой". Оно стало третьим в Беларуси предприятием строительного комплекса, получившим сертификат.

Показатели работы "Гродномпромстроя" заметно улучшились несколько лет назад, когда генеральным директором ОАО был назначен Алик Вагабов, переведенный в Гродно из стройтреста в Волковыске. Под его руководством "Гродномпромстрой" по итогам 2003 года занял второе место среди предприятий строительной отрасли страны. Кроме того, предприятие занесено на республиканскую Доску почета. На счету "Гродномпромстроя" – строительство и реконструкция крупнейших объектов в Гродно и области, в том числе оздоровительного центра "Озерный", табачной фабрики "Неман", крупнейшего супермаркета "Торгопт", физкультурно-оздоровительного комплекса, роддома и ряда других.

Получение международного сертификата на предприятии расценивают как очередную победу. В интервью БелаПАН А. Вагабов отметил, что это не только оценка работы коллектива, но и хорошая реклама для привлечения заказов и инвесторов, а также возможность вести строительные работы за пределами Беларуси.

Александр ХИЛИМОН

ЗДАРЭННІ

ШТО ТРАПІЛА ПАД РУКУ, ТЫМ І БІЛІ

ВАЎКАВЫСК. Беспрацоўны інвалід трэцяй групы з Ваўкавыска ў якасці аргумента ў спрэчцы з суседам выкарыстаў кавалак металічнай арматуры. Цяпер яму прыйдзецца адказаць па законе за нанясенне суседу целавых пашкоджанняў.

Іншаму беспрацоўнаму жыхару Ваўкавыска ў двары дома на вуліцы Першамайскай трапіла пад руку дошка, якой ён збіў вучня 10 класа, паведаміў на мінулым тыдні "Міліцэйскі веснік".

І ВАДЫ НАПІЛІСЯ, І НА ГРОШЫ РАЗЖЫЛІСЯ

СМАРГОНЬ. Да бабулі на падворак у вёсцы Крэва Смаргонскага раёна раніцай завіталі дзве цыганкі і папрасілі напіцца вады. Добрая жанчына пусціла іх у хату. Як адзначае "Міліцэйскі веснік", у той дзень не толькі смага дапякала цыганак. Вясковая пенсіянерка зразумела гэта запозна – калі недалічылася ў хаце 300 тысяч рублёў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЧАЛАВЕК І ЗАКОН

У ПОШУКАХ ПРАФЕСАРА БАНДАЖЭЎСКАГА



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Былая вайсковая часць у Гезгалах стала калоніяй

■ Сяргей ЧЫГРЫН

Па абвінавачванні ў атрыманні хабару ў буйных памерах 18 чэрвеня 2001 года рэктару Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, прафесару Юрыю Бандажэўскаму прысудзілі да 8 гадоў пазбаўлення волі.

На думку праваабаронцаў і замежных калег, беларускага вучонага судзілі за яго навуковую дзейнасць. Пры вывучэнні ўздзеяння малых доз радыяцыі на арганізм чалавека ён прыйшоў да высновы, што жыць на забруджаных (чарнобыльскіх) тэрыторыях смяртэльна небяспечна. Але гэтая выснова прафесара ідзе ўразрэз з сённяшнім афіцыйным дзяржаўным курсам на вяртанне людзей у апусцелыя раёны. А напярэдадні суда Еўрасаюз выдаў Юрыю Бандажэўскаму пашпарт свабоды, а гэта значыць, што сёння вучоны з'яўляецца вязнем сумлення.

Нядаўна беларускага прафесара з турмы, дзе ён адседзеў 3,5 гады, перавялі ў выпраўленчую калонію вольнага пасялення №26, якая месціцца ў Гезгалах Дзятлаўскага раёна. Карэспандэнты "ГС" вырашылі наведаць Юрыя Бандажэўскага.



■ Юрый Бандажэўскі

ДАВЕДКА

Юрый Бандажэўскі нарадзіўся ў 1957 годзе ў пасёлку Радунь Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт. Доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі медыцынскіх навук, акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, сапраўдны член Нью-Йоркскай акадэміі навук, ганаровы акадэмік Польскай акадэміі навук. З 1990 года працаваў рэктарам Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Аўтар больш за 250 навуковых прац, некалькіх вынаходніцтваў. Лаўрэат многіх прэмій.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПОШУКАЎ

У адну з чэрвеньскіх субот мы паехалі ў Гезгалы. Пасёлак Гезгалы размешчаны ў прыгожым лесе. Пры савецкім часе там знаходзілася вайсковая часць. Але вайскоўцаў там даўно ўжо няма, а замест іх па былой салдацкай тэрыторыі ходзяць зэкі, якія адбываюць тэрмін "вольнага пасялення". Ды і зняволеных там не так і шмат. Пераважна яны працуюць у сельскагаспадарчых кааператывах Дзятлаўшчыны.

Калі мы пад'ехалі да калоніі, то ўбачылі вялікі стэнд. На ім адлюстраваныя пяцікутная зорка і каска. Вось-вось, здаецца, з варот вайсковай часці выйдзе рота салдат і пачуецца песня: "Идёт солдат по городу, по незнакомой улице...". Але ніякай песні мы тут не пачулі, а калі зайшлі на КПП, то нас сустрэлі двое вайскоўцаў і адзін міліцыянер. На пытанне, як нам знайсці прафесара Бандажэўскага, асоба ў міліцэйскай форме сказала, што яго тут няма і што прафесар знаходзіцца ў адной з вёсак Гродзеншчыны. "А дзе канкрэтна?" — запыталіся мы. "Нам пра гэта нельга гаварыць. Пытайцеся ў нашага начальства ў Гродне", — адказалі ахоўнікі.

Побач з КПП мы заўважылі асуджаных, якія пілавалі дровы. Таму, не дамовіўшыся з вайскоўцамі і міліцыянерам, вырашылі звярнуцца да іх. На машыне ад'ехалі ад прахадной і пайшлі да мужыкоў-вольнапасяленцаў, якія нас адразу заўважылі і, відаць, хацелі нам дапамагчы. Як толькі мы падышлі бліжэй да асуджаных, нас заўважыў усё той жа міліцыянер, выскачыў з КПП і з крыкам: "Не положено!" — падбег да нас. "Вы не забывайце, што гэта калонія, тут сядзяць асуджаныя і вам з імі нельга размаўляць", — рапартаваў нам ахоўнік. Нельга дык нельга. Мы развіталіся і паехалі. Як толькі ад'ехалі метраў сто — заўважылі ў лесе мужчыну з жанчынаю і маленькую дзяўчынку з імі.

Вырашылі пра Бандажэўскага запытаць і ў іх. "Ведаю прафесара, — сказаў мужчына, — ён тут прабыў некалькі дзён, а пасля яго кудысьці перавезлі. А куды — сказаць не магу, бо такой інфармацыі не маю".

З калоніі №26 мы паехалі, як кажуць, "з пустымі рукамі". У адной з найбліжэйшых ад яе вёсак нам падказалі, што Юрый Бандажэўскі працуе пастухом у вёсцы Пескі Лідскага раёна. Таму з Гезгалаў наш шлях ляжаў у Пескі.

Вёска гэтая невялічкая, знаходзіцца на аўтатрасе Дзятлава—Ліда. З Пескаў да Ліды ўжо рукой падаць. Калі мы прыехалі ў гэтую вёску, найперш здзівіла тое, што амаль усе яе жыхары былі п'яныя.

На лаўках некалькі мужыкоў сядзелі і пілі разведзены спірт, закусваючы цыбуляю і хлебам. На іншых лаўках і надворках таксама вяскоўцы былі пад мухаю. Вядома, ніхто з іх у Песках Бандажэўскага не бачыў. Але вось пра такога прафесара чулі амаль усе.

З Пескаў мы завіталі ў вёску Мінойты. Знайшлі брыгадзіра мясцовай гаспадаркі. Але і ён не бачыў і нічога не ведаў пра тое, што Юрый Бандажэўскі знаходзіцца на тэрыторыі іх кааператыва.

Вяртаючыся дамоў, мы зноў заехалі ў Гезгалы, але не ў самую калонію, а ў гарадок, дзе жылі былыя савецкія афіцэры. У шматпавярхоўках цяпер кватаруюць не вайскоўцы, а простыя людзі. Многія з іх сядзяць без працы.

Дарэчы, каля мясцовай крамы швэндалася шмат п'яных мужыкоў і жанчын з сінімі насамі. Тут мы планавалі пагутарыць з адным з ахоўнікаў калоніі №26. Але ён быў у водпуску і, моцна п'яны, спаў у сваёй кватэры. Гутаркі з ім не атрымалася.

У гэты самы дзень позна ўвечары мы вярнуліся ў Слонім.

ДРУГІ ДЗЕНЬ ПОШУКАЎ

Перш чым зноў ехаць на Дзятлаўшчыну ў пошуках беларускага доктара медыцынскіх навук Юрыя Бандажэўскага, мы па тэлефоне ў Гомелі адшукалі яго жонку Галіну. Спадарыня Галіна нам паведаміла каардынаты знаходжання свайго мужа і дазволіла яго наведаць.

Пасля яе слоў мы зноў адправіліся на Лідчыну (па просьбе Юрыя Бандажэўскага не ўказваем назвы вёскі), дзе і сустрэліся з вядомым прафесарам.

Знайшлі цяпер Юрыя Іванавіча вельмі хутка. Жыве ён у маленькай хатцы побач з калгаснаю кантораю і сельсаветам. За ім вельмі пільна сочаць мясцовыя начальнікі і кантралююць кожны яго крок. Працуе — вядомы на ўсю Еўропу доктар навук — вартаўніком. Калі мы завіталі ў ягоны вясковы домік, Юрый Бандажэўскі быў вельмі здзіўлены, як мы яго тут знайшлі.

Сваё жытло вольнапасяленец добраўпарадкаваў. На сценах і на падлозе — дываны, на стале — тэлевізар і камп'ютэр, а таксама папкі з навуковымі працамі і артыкуламі па медыцыне. Да Інтэрнету камп'ютэр падключаць не дазваляюць, не дазваляюць прафесару мець і тэлефон.

Пагутарыць мы паспелі мінут дваццаць, пакуль нам не перашкодзіў старшыня мясцовага сельскагаспадарчага кааператыва. Ён, маўляў, баіцца і за сябе, і за Бандажэўскага. Таму такія сустрэчы вельмі небяспечныя.

Тым не менш, са слоў Юрыя Бандажэўскага, мы даведаліся, як быў сфальсіфікаваны ягоны арышт, як яго судзілі і арыштоўвалі. А яшчэ, на думку доктара навук, сённяшнія ўлады і беларускае грамадства да чарнобыльскай праблемы сталі адносіцца больш абыякава. Але ўсе яны памыляюцца, бо Чарнобыль да нас прыйшоў назаўсёды — і гэта найвялікшы боль беларускага народа.

За той час, калі Юрый Бандажэўскі пазбаўлены волі, у ягоную падтрымку прыйшло больш за 25 тысяч пісем, паштовак, бандэроляў і сувеніраў з многіх краін свету. А 15 французскіх гарадоў ушанавалі беларускага доктара навук званнем ганаровага грамадзяніна. Ён нават стаў ганаровым грамадзянінам Парыжа.

Мы развіталіся з Юрыем Бандажэўскім і пажадалі яму хуткага вызвалення. Ён нас правёў за веснічкі сваёй невялікай вясковай хаткі. Разам з ім быў маленькі сабачка. "Гэта мая ахова", — сказаў Юрый Іванавіч і ўсміхнуўся. На душы ў яго і ў нас стала неяк сумна.

СТИХИЯ



Так выглядели многие дома на Пружанщине после урагана

ПОСЛЕДСТВИЯ УРАГАНА ЛИКВИДИРУЮТ

В Брестской области ликвидируют последствия урагана, который пронесся над страной в ночь на 10 июля.

По сообщению министра по чрезвычайным ситуациям, в результате ураганного ветра с проливным дождем в области пострадали 385 населенных пунктов.

Повреждены более 70 жилых домов и сельскохозяйственных построек, обесточены более 100 трансформаторных подстанций, повреждены около 90 км линий электропередачи и связи.

Из-за обрыва силовых тяговых линий и линии системы сигнализации было остановлено движение скорого поезда Брест–Москва, двух электропоездов и двух грузовых поездов.

По словам губернатора области Константина Сумара, значительные потери понесло сельское хозяйство: стихия уничтожила около 100 тысяч га посевов, или около 40 процентов посеянных площадей, сильно пострадали лесные массивы.

По предварительным подсчетам, уничтожено более 600 га леса.

ИТАР–ТАСС

ПАЛІТЫКА

ЛУКАШЭНКА БУДЗЕ ДАМІНАВАЦЬ НА ПАЛІТЫЧНАЙ СЦЭНЕ БЕЛАРУСІ

У найбліжэйшыя два гады Аляксандр Лукашэнка будзе дамінаваць на палітычнай сцэне Беларусі, шукаючы пры гэтым спосабу падоўжыць свае прэзідэнцкія паўнамоцтвы, — такі прагноз робіць брытанскі тыднёвік "Economist".

Эксперты допускаюць, што для працягу свайго прэзідэнцтва Лукашэнка скарыстае рэферэндум. Найбольш праўдападобны тэрмін яго правядзення – другая палова 2005 года.

"Лукашэнкава адміністрацыя, – піша "Economist", – будзе рыхтаваць рэферэндум, пашыраючы праз кантраляваныя дзяржаваю медыі погляд, што цяперашні прэзідэнт, канечне, патрэбны для стабільнага развіцця краіны".

Незалежныя медыі, таксама як і не ўрадавыя арганізацыі, апынуцца, на думку экспертаў, пад нарастальным ціскам уладаў. Асноўныя апазіцыйныя партыі, не маючы доступу да агульнадаступных радыё- і тэлевізійных каналаў, будуць заставацца ў ізаляцыі. "Economist" не выключае пераследу апазіцыйных лідэраў напярэдадні магчымага рэферэндуму.

"Лукашэнкаў рэжым, – пішуць эксперты, – падрыхтаваў ужо грунт для пераследу іншадумцаў, заяўляючы пра неабходнасць абараніць законапаслухмяных беларусаў ад дзеянняў апазіцыі".

Ацэньваючы палітычныя выклікі для беларускага прэзідэнта, эксперты брытанскага тыднёвіка не лічаць іх за сур'ёзныя.

"Па-першае, непраўдападобна, – піша "Economist", – каб Расія магла пазбавіць Лукашэнку ўлады, прынамсі, да таго часу, пакуль расійскі прэзідэнт Уладзімір Пуцін прытрымліваецца думкі, што цяперашні стан рэчаў у дачыненнях з Беларуссю адпавядае інтарэсам Расіі. Па-другое, апазіцыя дасягнула малога прагрэсу ў наладжванні кантактаў з чыноўніцтвам і парламентарыямі, не задаволенымі Лукашэнкам за ягоныя непрадказальныя паводзіны".

Беручы пад увагу парламенцкія выбары 2000 года, эксперты "Economist'a" сумняваюцца, што сёлетнія выбары ў Палату прадстаўнікоў могуць быць свабоднымі і сумленнымі. Тыднёвік прагназуе, што беларускія "ўлады захочуць зрабіць усё, каб апаненты заставаліся ў поўнай ізаляцыі і не змаглі выкарыстаць парламенцкую трыбуну для крытыкі курсу дзяржавы або арганізацыі кампаніі супраць канстытуцыйнага рэферэндуму.

"Тым не менш, – піша "Economist", – апазіцыйныя партыі могуць дасягнуць поспеху ў стварэнні адзінага выбарчага блока, прычым з удзелам арганізацый, якія рэпрэзентуюць інтарэсы прыватных прадпрымальнікаў".

Ацэньваючы шанцы апазіцыі на восеньскіх выбарах, "Economist" выказвае сумнеў, што яе прадстаўнікі могуць здабыць звыш 10% месцаў у новым парламенце.

Спалучанае з антызаходняй рыторыкаю ігнараванне афіцыйным Мінскам палітычных свабод асуджае Беларусь, на думку экспертаў, на далейшую міжнародную ізаляцыю.

"Economist" прадказвае традыцыйна асабліва рэзкую крытыку з боку Злучаных Штатаў і больш памяркоўную з боку Еўрасаюза. Аўтары брытанскага тыднёвіка лічаць, што важнай асаблівасцю замежнай палітыкі Беларусі застанецца курс на інтэграцыю з Расіяй.

"Хаця абодва бакі маюць несумяшчальнае бачанне характару будучай "саюзнай дзяржавы", ніводзін не гатовы адмовіцца ад інтэграцыйнага працэсу наогул. Тым не менш шмат якія з інтэграцыйных планаў будуць па-ранейшаму адкладацца, а супярэчнасці паміж бакамі застануцца", – прагназуюць эксперты часопіса "Economist".

Радыё Свабода

НОВОСТИ

ПЛАТИТЬ БУДЕМ ЗА ПРОЕЗД ПО «ОЛИМПИЙКЕ»

ТРАНСПОРТ. С декабря 2004 года в Беларуси может начаться взимание платы за проезд по автодороге М1/Е30 Брест–Минск–граница России с отечественных пользователей грузовых двухосных автомобилей.

Об этом 8 июля на пресс-конференции сообщил первый заместитель министра транспорта и коммуникаций, директор департамента "Белавтодор" Александр Минин.

Глава "Белавтодора" отметил, что трасса М1/Е30 остается единственной в Беларуси платной автодорогой. Как известно, сейчас плата за проезд по этой трассе взимается только с транспортных средств иностранных государств и белорусских транспортных средств, имеющих три и более осей. Вместе с тем поступления за проезд по ней покрывают лишь 32 процента расходов на содержание автодороги, ее развитие и реконструкцию.

Предполагается, что сумма сбора с отечественных двухосных грузовиков, проезжающих по дороге М1/Е30, будет не очень велика и составит порядка 1 тысячи рублей за проезд через один пункт пропуска, каждый из которых составляет примерно 200 км.

Автомобильная дорога М1/Е30 Брест–Минск–граница России имеет протяженность по территории Беларуси 610 километров. Для приведения этой дороги в соответствие с международными требованиями в период с 1994 по 1998 годы был получен кредит ЕБРР в размере 50 млн. долларов. Согласно условиям банка и решению правительства Беларуси, погашение кредита должно быть завершено в 2007 году за счет взимания платы с иностранных и белорусских владельцев (пользователей) транспортных средств.

БелаПАН

КОМПАКТ-ДИСКИ РАСТУТ В ЦЕНЕ

ЦЕНЫ. С июля в Беларуси в 2,5–3 раза выросли цены на музыкальные компакт-диски, отечественные и зарубежные.

Если недавно CD можно было купить за 5 тысяч рублей, то сейчас – минимум за 13–15 тысяч. Подорожание специалисты объясняют разными причинами, а у покупателей оно вызывает бурю возмущения.

